# З Новым годам!


# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

26 снежня 2001 года, серада, № 19 (1848)


## Дорогие друзья!

Вот и подошел к концу 2001 год. Для большого университетского коллектива он был не только годом старта в новое столетие, но и годом подведения итогов, годом 80-летнего юбилея. Все это время БГУ с честью нес знамя лидера высшей школы страны: не только готовил специалистов самой высокой квалификации, но и помогал становлению других белорусских вузов, вел широкомасштабные научные исследования, работал на страну в целом.

В этом огромная заслуга **ветеранов** университета. Эти люди отдали университету весь свой интеллектуальный потенциал, как святыню пронесли его через все трудности прошлых десятилетий и, как эстафету, бережно передали в надежные руки новых поколений. Именно поэтому они — живое воплощение университетской традиции, великой идеи Университета. Дорогие наши ветераны! Ваше мнение, ваш опыт всегда будут востребованы в университете. На основе **ваших** достижений мы строим новый университет, университет XXI века. И строим успешно.

Сегодня я хочу еще раз поблагодарить весь многотысячный университетский коллектив за труд, за верность университетским традициям, за единство. Благодаря вам, дорогие друзья, БГУ за несколько последних лет сделал новый уверенный шаг вперед в своем развитии. Да и все мы за это время стали более уверенными в себе, раскрепощенными, а значит более **свободными.** Свобода же — главное условие интеллектуального творчества.

Я благодарен **учащимся, студентам, магистрантам и аспирантам** университета за серьезный подход к овладению знаниями, творческий порыв в научном поиске. Я желаю вам, дорогие друзья, успешно сдать экзамены и зачеты, хорошо отдохнуть на каникулах. Однако и на отдыхе не забывайте: вы — будущая элита страны, именно на ваши плечи ляжет ответственность за судьбу Беларуси в XXI веке, а это ко многому обязывает и в учебе, и в научной работе, и в гражданском становлении. Именно к этому вас готовят и на занятиях, и своим примером ваши **преподаватели**.

В этом году на их плечи легла основная тяжесть работы по содержательному реформированию образовательного процесса в БГУ. И вы с ней, уважаемые преподаватели, успешно справляетесь. Не сомневаюсь, что и в новом году вы так же счастливо будете сочетать в своей деятельности творческий задор и ученую мудрость. Желаю вам новых успехов в работе и прежде всего — талантливых учеников, которые подхватят и разовьют ваши идеи.

На новый уровень развития вышла в этом году университетская **наука**. Уже не только результаты работы университетских ученых востребованы в Беларуси и многих других странах, но и сам опыт организации научной деятельности в БГУ пристально изучается многими ведущими университетами разных стран. И в новом году у вас есть многое для успеха — знания, опыт, квалификация, поддержка руководства университета. Остается пожелать удачи, без которой не обойтись и в научном поиске.

За сравнительно небольшой срок органично влились в дружную университетскую семью и стали ее неотъемлемой частью работники новой для БГУ **производственно-инновационной сферы**. Уверен, в новом году этот союз станет еще теснее, еще крепче, принесет зримый экономический и социальный эффект.

Я поздравляю с наступающими праздниками весь **обслуживающий персонал** университета, чей ежедневный труд очень важен для коллектива университета.

Самые теплые поздравления и пожелания в эти предпраздничные дни всем **выпускникам** университета. Мы о вас помним и всегда рады видеть вас в стенах БГУ. Не забывайте и вы об университете, давшем вам путевку в жизнь.

Самые теплые пожелания хочется высказать также в адрес многочисленных **друзей БГУ** — тех, кто был с нами и в радостные, и в трудные времена, кто словом и делом помогает поднимать наш университет до уровня лучших классических университетов Европы.

И, наконец, я просто обязан отдельно поздравить с наступающими праздниками наших **женщин**. Дорогие, своим творческим подходом к работе, красотой и духовностью именно вы задаете планку отношений в БГУ. Оставайтесь такими всегда! Я желаю вам встретить и прожить новый год с улыбкой на лице.

**Дорогие друзья!**

Наступающий год по восточному календарю — год Лошади. А значит, успех в новом году в первую очередь ждет тех, кто привык жить в ладу со своей совестью, много и упорно трудиться, для кого служение Истине, Нравственности и Красоте не пустые слова, а жизненные принципы. Это **наш** год, год Университета!

С праздниками **всех вас**, дорогие друзья! Пусть Новый год принесет вам исполнение самых сокровенных желаний! Пусть никогда не покидает ваш дом достаток и уверенность в будущем! Пусть новый 2002 год станет для вас, для ваших близких годом счастья, годом творческого труда и новых достижений, годом духовного совершенствования!

Пусть крепнет и развивается наш общий дом, наш **Университет!**

***Ректор Белорусского государственного университета профессор Александр КОЗУЛИН***




*Фота IREX/PROMEDIA*

ТРАДЫЦЫІ

## Светлага шляху табе, Новы год!

Новы год — улюбёнае свята нашага дзяцінства. У маленстве мы чакаем яго з той жа нецярплівасцю, як і дзень нараджэння. Падрастаючы, мы разумеем, што Дзеда Мароза і Снягуркі насамрэч няма, але працягваем адзначаць гэтае свята. Дарэчы, любяць яго не толькі ў нас, але і ва ўсім свеце. І бадай у кожнай краіне існуе свая традыцыя сустрэчы Новага года.

У Італіі лічыцца, што Новы год трэба пачынаць, вызваліўшыся ад усяго старога. Таму ў навагоднюю ноч італьянцы выкідаюць з вокнаў старыя рэчы. Трэба пільнавацца, калі не хочаш атрымаць па галаве выкінутым прасам ці саламяным крэслам. Бо італьянцы, як і належыць народам поўдня, усё робяць тэмпераментна — усю старызну выкідаюць з размахам... Лічыцца, што вызваленае месца абавязкова зоймуць старыя рэчы.

На навагоднім стале ў італьянцаў абавязкова ёсць арэхі, сачавіца і вінаград — сімвалы доўгага жыцця, здароўя і дабрабыту.

У італьянскай правінцыі здаўна існуе звычай: 1 студзеня раніцой трэба прынесці дадому "новую ваду" з крыніцы, якая, нібыта, прыносіць шчасце. "Калі табе няма чаго падарыць сябрам, — кажуць італьянцы, — падары "новую ваду" з аліўкавай галінкай".

Для італьянцаў таксама важна, каго яны першым сустрэнуць у новым годзе. Калі 1 студзеня першым сустрэчным будзе манах ці святар — гэта кепска. Непажадана таксама сустракацца з малым дзіцём, а сустрэць сімпатычнага дзядулю — дужа добра! Яшчэ лепш, калі ён да таго ж і гарбаты... Вось тады наступны год і сапраўды будзе шчаслівым!

Для дзяцей у Італіі Новы год пачынаецца з 6 студзеня. Уся італьянская дзятва чакае добрую фею Бефану. Яна прылятае ўначы на чароўнай мятле і адчыняе дзверы маленькім залатым ключыкам. Увайшоўшы ў пакой, дзе спяць дзеці, яна напаўняе падарункамі дзіцячыя панчохі, спецыяльна падвешаныя на камін. Тым, хто кепска навучаўся ці сваволіў, Бефана пакідае дробку прысаку ці вугельчык. Крыўдна, вядома, але — сам зарабіў!..

А ў Швецыі перад Новым годам дзеці выбіраюць каралеву свету Лючыю. Яе апранаюць у белую сукенку, на галаву надзяваюць карону з запаленымі свечкамі. Лючыя прыносіць падарункі дзецям і прысмакі свойскім жывёлам: кату — вяршкі, сабаку — костачку, вослiку — моркву.

Французскі Дзед Мароз — Пер Наэль — прыходзіць у навагоднюю ноч і пакідае падарункі ў дзіцячых чаравічках. Той, каму дастаецца боб, запечаны ў навагодні пірог, атрымлівае тытул "бабовага караля" і ў святочную ноч усе падначальваюцца яго загадам.

Хаця французы славяцца сваёй шчадралюбнасцю, у навагоднюю ноч яны з большай ахвотай не цалуюцца, а наядаюцца і напіваюцца. Паводле традыцыі, добры гаспадар-вінароб мусіць абавязкова чокнуцца з бочкай віна, павіншаваць яе са святам і выпіць за будучы ўраджай. А паколькі віно ў Францыі не робіць толькі лянотны, можна ўявіць тую весялосць, якая пры гэтым наступае.

У Калумбіі галоўным героем навагодняга карнавалу з'яўляецца Стары год. Ён гуляе сярод натоўпу на высокіх хадулях і распавядае дзецям смешныя гісторыі. А калумбійскі Дзед Мароз — гэта яшчэ адзін персанаж свята, яго завуць Тата Паскуале. Ніхто лепш за яго не ўмее ладзіць феерверкі.

На Кубе дзіцячае навагодняе свята называецца Днём каралёў — у гонар вядомых персанажаў біблейскага падання. Каралёў-чараўнікоў, якія прыносяць дзятве падарункі, завуць Бальтасар, Гаспар і Мэльчор. Дзеці загадзя пішуць ім лісты, у якіх распавядаюць пра свае запаветныя мары.

Напярэдадні Новага года кубінцы запаўняюць вадой увесь посуд, які ёсць у доме, і пачынаюць апоўначы выліваць яе з вокнаў. Гэтак жыхары вострава зычаць новаму году светлага і чыстага, нібы вада, шляху. А за той час, пакуль гадзіннік б'е 12 разоў, трэба паспець з'есці 12 вінаградзінак: удасца — значыць, дабрыня, згода, дабрабыт і ласка будуць суправаджаць вас цягам усіх дванаццаці месяцаў.

*Падрыхтаваў М. ТАПІЛЯ*

КОНКУРС

# Еўрапейскі Саюз. Які ён?

*Цэнтр еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта абвяшчае конкурс на лепшую студэнцкую работу на тэму "Еўрапейскі Саюз у XXI стагоддзі".*

Мэты конкурсу — прыцягнуць да еўрапейскай тэматыкі ўвагу моладзі, якая навучаецца; заахвоціць даследаванні праблемаў еўрапейскай інтэграцыі; раскрыць магчымасці Цэнтра еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі БДУ ў якасці крыніцы інфармацыі пра Еўрапейскі Саюз.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца студэнты і аспіранты вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь.

Тэматыка работ, якія прымаюцца на разгляд:

эвалюцыя Еўрапейскага Саюза на цяперашнім этапе;

рэалізацыя разнастайных накірункаў палітыкі Еўрапейскага Саюза;

увядзенне еўра;

працэс пашырэння Еўрапейскага Саюза і пазіцыі краін-кандыдатаў;

перспектывы ўзаемадзеяння Рэспублікі Беларусь з Еўрапейскім Саюзам.

Журы конкурсу складаецца з выкладчыкаў ВНУ — спецыялістаў у галіне еўрапейскай інтэграцыі, прадстаўнікоў каардынатараў праекта, прадстаўнікоў офіса TACIS.

На разгляд прымаюцца працы (эсэ) адвольнай формы, напісаныя спецыяльна для конкурсу. Аб'ём працы — не больш за 6 старонак фармату А4 пры памеры шрыфту Times New Roman 12 і паўтарачным міжрадковым інтэрвале.

Пры разглядзе работ будзе браца пад увагу найперш узровень ведаў удзельніка конкурсу аб праблемах еўрапейскай інтэграцыі, арыгінальнасць падачы матэрыялу, адлюстраванне асабістай ацэнкі разглядаемай праблемы. Лепшыя работы атрымаюць рэкамендацыю для апублікавання ў навуковых выданнях і сродках масавай інфармацыі.

Для пераможцаў конкурсу ўстанаўліваюцца наступныя прызы:

I месца — падарунак коштам 150 еўра;

II месца — падарунак коштам 100 еўра;

III месца — падарунак коштам 50 еўра.

Канкурсанты павінны накіраваць на адрас Цэнтра еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі БДУ адзін асобнік работы з абавязковым указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка, паштовага адрасу (адрасу электроннай пошты), кантактнага нумару тэлефона (факса), а таксама ксеракопію студэнцкага білета ці аспіранцкага пасведчання.

Адрас Цэнтра еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі БДУ: праспект Ф. Скарыны, 4 (галоўны корпус), пакой 206, тэл. 209-54-46, e-mail: tchebotarev@bsu.by, інтэрнэт-старонка: www.ced.bsu.by.

Пра тэрміны правядзення конкурсу будзе паведамлена дадаткова.

АБ'ЯВЫ

Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы БДУ (вул. Маскоўская, 15) аб'яўляе чарговы набор выкладчыкаў і супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта на курсы па вывучэнні замежнай мовы (англійская, нямецкая). Тэрмін навучання — 4 месяцы (2 разы на тыдзень па 4 акадэмічныя гадзіны). Пачатак заняткаў 14 студзеня 2002 года. Навучанне бясплатнае. Даведкі па тэл. 213-11-64.

## Установа БДУ "Навукова-даследчы інстытут фізіка-хімічных праблем"

*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:*

**ЗАГАДЧЫКА СЕКТАРА** неарганічных сарбентаў і антыкаразійных пакрыццяў;

**НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА** сектара агнегасячых матэрыялаў;

**НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА** лабараторыі тэрмадынамікі арганічных рэчываў.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, аддзел кадраў НДІ ФХП БДУ.*

ВІНШУЕМ!

## З днём нараджэння!



26 снежня, якраз пад Новы год, Мечыславу Мікітавічу Шкурдзюку спаўняецца 60 гадоў. Каля 30 з іх ён аддаў друкарні БДУ, дзе працаваў дырэктарам. Трэба сказаць, што ў гады яго кіравання калектыў друкарні неаднаразова быў узнагароджаны за добрую працу граматамі Міністэрства ВНУ БССР, а ў 1982 годзе атрымаў пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства ВНУ СССР. Усе супрацоўнікі універсітэта, якія працавалі разам з ім і добра яго ведаюць, віншуюць Мечыслава Мікітавіча са знамянальнай датай, зычаць яму моцнага здароўя, доўгіх гадоў жыцця і поспехаў ва ўсіх справах.

ФОТАПОЗІРК



*Фота IREX/PROMEDIA*

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

## Старт святкаванням

У студэнцкім гарадку ўжо дадзены старт навагоднім святкаванням. Так, 20 і 21 студзеня прайшлі навагоднія вечары ў інтэрнатах № 4 і 6, а таксама ў сталовай інтэрната № 5. Сёння навагодняя вечарына пройдзе ў інтэрнатах № 5, 7 і 9. А заўтра, 27 снежня, будуць святкаваць студэнты інтэрната № 1. У інтэрнатах № 3 і 10 28 снежня адбудуцца навагоднія балі-маскарады для студэнтаў. Пачатак усіх вечарынаў у 19.00.

А пасля Новага года, 5 студзеня, для дзяцей супрацоўнікаў студгарадка БДУ пройдзе навагодні ранішнік. Ён пачнецца ў 12 гадзінаў у сталовай інтэрната № 5.

## Падведзены вынікі года

18 снежня ў студэнцкім гарадку БДУ адбыўся справаздачны сход па навукова-даследчай дзейнасці за 2001 год, на якім прысутнічалі прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.В. Сувораў, прафесар кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі І.І. Казімірская, начальнік Цэнтра інфармацыйных тэхналогій, загадчык кафедры сацыяльнай педагогікі БДПУ М.І. Дронь, адміністрацыя студэнцкага гарадка БДУ на чале з дырэктарам П.М. Бычкоўскім, педагагічны калектыў.

У 2001 годзе ў студэнцкім гарадку распрацавана сучасная канцэпцыя шматузроўневай арганізацыі сацыяльна-псіхалагічнай работы ў студэнцкім інтэрнаце, канцэпцыя сацыяльнай абароны моладзі, праведзены аналіз праблем адаптацыі і сацыялізацыі студэнтаў. У мэтах павышэння прафесійнага ўзроўню педагогаў і аналізу эксперыментальнай работы праводзіліся семінары і метадычныя заняткі для сацыяльных педагогаў, педагогаў-псіхолагаў, педагогаў-арганізатараў, студэнцкага актыву.

Значная работа была праведзена па выпрацоўцы нарматыўна-прававой базы, сус праваджальнай дакументацыі (створаны і прымяняюцца на практыцы журналы сацыяльнага педагога і педагога-псіхолага), вызначаны асноўныя накірункі выхаваўчай работы: сацыяльна-педагагічны, сацыяльна-прававы, сацыяльна-псіхалагічны, культурна-масавы, спартыўна-аздараўленчы і інш. На падставе праведзеных даследаванняў распрацаваны базавыя праграмы "Студэнцкае самакіраванне", "Фестываль студэнцкай творчасці", "Турызм і адпачынак", "Спартакіяда студэнцкага гарадка", "Студэнцкая сям'я — XXI стагоддзе", "Працоўнае лета".

У студэнцкім гарадку створаны унікальны, адзіны ў рэспубліцы метадычны цэнтр, супрацоўнікі якога займаюцца даследаваннем інавацыйных метадаў і формаў выхаваўчай работы, педагагічных тэхналогій, распрацоўкай метадычнай базы, планаваннем і правядзеннем метадычных семінараў.

Праведзеная работа за справаздачны перыяд атрымала высокую ацэнку не толькі калектыву студгарадка, але і запрошаных спецыялістаў.

*Іна ХАЗЕЕВА,*
*метадыст студэнцкага гарадка БДУ*

ФЕСТЫВАЛІ

# Сярэбраныя струны — 2001

Іх называюць па-рознаму: барды, менестрэлі, аўтары і выканаўцы самадзейнай песні. Мы іх назвалі паэтычна — "Сярэбраныя струны". Сапраўды, ці ўяўляе хто-небудзь студэнцкае жыццё без вернай сяброўкі-гітары, калі пад звон струн спявае сама маладосць? А сярэбраныя — ад ззяння снегу за вокнамі, ад гучання прыгожых маладых галасоў. Сярэбраныя — бо залатыя вяршыні наперадзе. Сярэбраныя яшчэ і таму, што такія струны — традыцыйны падарунак пераможцам конкурсу.

Вось ужо чацвёрты раз фестываль аўтарскай песні студэнцкага гарадка БДУ "Сярэбраныя струны" сабраў прыхільнікаў студэнцкай песні. 13 снежня ў актавай зале філалагічнага факультэта пачаўся фінал конкурсу (адборачныя туры прайшлі напярэдадні ва ўсіх інтэрнатах). Найлепшыя студэнцкія спевакі спаборнічалі ў намінацыях "Аўтар" і "Выканаўца" і адначасова дарылі ўдзячным слухачам свае песні, свой настрой.

Трэба адзначыць, што сёлета традыцыйны зімовы фестываль атрымаўся даволі "гарачым" і журы было вельмі складана вызначыць пераможцу. Каму аддаць перавагу: лірычнаму напеву "Шлях да князёўны" ці надрыўнаму "Жах перад сабой", "Подожгите небо", узнёслай, паэтычнай "Сырой осени, что стала первою весной" ці пранікнёнаму жаночаму "Дай мне руку і шлях не суроч"?

Пасля доўгіх абмеркаванняў выбар зроблены. І вось 14 снежня адбыўся гала-канцэрт, у якім прынялі ўдзел лаўрэаты конкурсу, а таксама пераможца мінулага фестывалю Яўген Сілівонец, прэзідэнт Клуба студэнцкай песні студгарадка Андрэй Іваркоўскі, кансультант Клуба аўтарскай песні БДУ Георгій Тучкоўскі.

Пераможцамі ў намінацыі "Аўтар" сталі: Міхаіл Кот (інтэрнат № 9) Зміцер Матуйза (інтэрнат № 1) — 1 месца; Вадзім Кіенка (інтэрнат № 5) — 2 месца; Алена Сахвон і Марыя Станоўка (інтэрнат № 7) — 3 месца.

Лепшымі выканаўцаміназваны: Вольга Касцюкевіч (інтэрант № 7) — 1 месца; Дзяніс Сарканс-Лонскіс (інтэрнат № 1) — 2 месца; Ігар Багасай (інтэрнат № 10) і Ілья Дабрыдзенеў (інтэрнат № 3) — 3 месца. Спецыяльным прызам узнагароджаны Сяргей Чарноў, аспірант гістарычнага факультэта (інтэрнат № 10).

Ну, а найвышэйшую ўзнагароду фестывалю, Гран-пры, атрымаў студэнт факультэта журналістыкі — Алесь Герасіменка з 10-га інтэрната.

Мы вельмі ўдзячныя ўсім удзельнікам, зычым ім творчых поспехаў, віншуем пераможцаў. Асаблівая падзяка грамадскаму аб'яднанню "Апякунскі савет студэнцкага гарадка БДУ", пры падтрымцы якога штогод праходзіць фестываль "Сярэбраныя струны".

*Іна ХАЗЕЕВА,*
*метадыст студгарадка БДУ*

ВЫСТАВЫ

# Пра тых, хто адкрывае Зямлю...

Студэнтам геаграфічнага факультэта на працягу 5 гадоў распавядаюць, наколькі прыгожая і разнастайная наша планета. Таму студэнты ведаюць, што, дзе, чаму і калі на Зямлі расце і развіваецца: горы і даліны, рэкі, лясы, пустыні. На жаль, многае з гэтага мы ведаем толькі па кнігах і дакументальных фільмах: большасць студэнтаў ніколі не бачыла ні пустыняў, ні гор, ні велізарных рэк і азёраў, ні акіяна. Шанцуе толькі некаторым.

У іх не так і багата грошай (а часам і зусім няма) — таму яны падарожнічаюць аўтастопам. На іх цісньць вучэбнай праграмай і абавязковым наведваннем заняткаў. Але ўсё ж надыходзіць час, калі яны проста не могуць заставацца ў горадзе і пачынаюць складаць заплечнік...

У фае корпуса геаграфічнага факультэта з 11 па 22 снежня праходзіла выстава фотапрацаў студэнтаў, прысвечаная іх самастойным падарожжам і экспедыцыям сёлета. Перад вачыма гледачоў выставы разгарнуліся панарамы Крыма, Карэліі, Цянь-Шаня, Байкала, Белага мора і мноства іншых куточкаў Расіі, а таксама краявіды Беларусі і Украіны. Кожны наведнік выставы змог убачыць прыгажосць і разнастайнасць нашай Зямлі. Хаця, вядома, раскрыць пачуцці людзей, якія пабывалі ў гэтых мясцінах, немагчыма ні на фота, ні словамі. Хіба можа хто-небудзь пераказаць адчуванне шчасця?..

Паказаць студэнтам, што нават зараз у свеце ёсць месца рамантыцы і прыгодам, што падарожнічаць можна і патрэбна — гэтую мэту выстава выканала. І мы вельмі ўдзячныя дэканату геаграфічнага факультэта, які з увагай паставіўся да прапановы арганізаваць выставу і прадаставіў стэнд для фатаграфій. Таксама ўдзельнікі падарожжа на Байкал выказваюць падзяку фірме "Фокус", генеральнаму прадстаўніку фірмы "Кодак" у Беларусі, і асабіста яе камерцыйнаму дырэктару С.Ф. Цыбульскаму за прадастаўленую фотаплёнку.

*Віталь МІЧКОЎ,*
*член аргкамітэта выставы,*
*студэнт V курса*
*геаграфічнага факультэта*

І ЖАРТАМ, І ЎСУР'ЁЗ

# Як мы загадваем – так і адбываецца

Зімовы сонцаварот — самы казачны час года. Нездарма яго яшчэ задоўга да хрысціянства лічылі адным з галоўных святаў году. У гэты час па вуліцах ходзяць Дзед Мароз са Снягуркаю, над дахамі нячутна пралятаюць то злая Снежная Каралева, то добрая фея Бефана. Па заснежаных палях ходзіць адзінокая Мора, недзе ў далёкіх скандынаўскіх гарах спіць велікан Імір, а спадарыня Завіруха — фраў Холле — усё трасе ў нябёсах сваю чароўную пярыну.

Каляды заўсёды карысталіся папулярнасцю ў нашых продкаў. А саму назву "Каляды" можна супаставіць з рымскімі Kalendae. Такія святкаванні існавалі ў Рымскай імперыі і Егіпце, у грэкаў і індзійцаў.

У калядную нядзелю, што ішла за Раством, праваслаўным у старадаўняй Русі дазвалялася амаль усё: піць нямерана, біцца, гарлаць песні на вуліцы, цалавацца і хапаць дзевак за бакі. Людзі хадзілі адзін да аднаго ў госці, каталіся з горак, калядавалі і варажылі.

Варажба — гэта неад'емная частка Калядаў. Гэтая з'ява настолькі старажытная, што згадкі пра яе можна сустрэць у разнастайных пісьмовых помніках Егіпта, Грэцыі і іншых краін свету, а таксама ў Бібліі. Была пашырана варажба і сярод славян: ёю займаліся пераважна жрацы, варажбіты, ведзьмары і чараўнікі.

Звычайна праваслаўныя варажбе прысвячаюць час з Раства (7 студзеня) да Хрышчэння (19 студзеня). А ў каталіцкім свеце, дзе Раство святкуюць 25 снежня, калядныя святкаванні доўжацца з 25 снежня па 5 студзеня. Спакон веку лічылася, што ў святочны час уся нячыстая сіла адступае перад вялікай радасцю Раства і нішто не перашкаджае зазірнуць у будучыню.

Варажылі на розных прадметах, але мэта заўсёды была адна — прадказаць лёс. І даўней, і сёння варожаць, як правіла, маладыя незамужнія дзяўчаты, але занятак гэты падыходзіць для любога ўзросту.

Ключы, воск, брэх сабак, пакінутая на ганку рукавіца, падслуханы ўрывак фразы, след пад акном — усё гэта выкарыстоўвалася і выкарыстоўваецца для таго, каб убачыць наканаванне лёсу. Зразумела, час накладае свой адбітак на спосабы прадказання, таму прапануем найбольш зручныя на сёння спосабы варажбы, якімі можна скарыстацца як у горадзе, так і ў вёсцы.

Усе віды варажбы можна падзяліць на тры катэгорыі. Першая — *вечаровая* варажба. Яна пачынаецца з таго часу, калі ў дамах запальваюць святло. Яна можа быць, напрыклад, такой. Дзяўчына выходзіць на вуліцу і пытае ў першага сустрэчнага яго імя. Гэтае ж імя, як мяркуецца, будзе насіць і яе нарачоны. Такая варажба звычайна адбываецца пад стары Новы год і падрабязна апісана ў рамане А.С. Пушкіна "Яўгеній Анегін".

*Паўночная* варажба пачынаецца з 12 гадзін ночы. У гэтых відах варажбы могуць прымаць удзел ужо дарослыя дзяўчаты, дый то ў прысутнасці бабулек.

Смелая дзяўчына можа адважыцца на такі від варажбы: яна застаецца адна ў пакоі, накрывае стол абрусом, выстаўляе сталовы прыбор без нажа і відэльца і запрашае ў голас: "Суджаны, раджаны! Прыходзь да мяне вячэраць!"

Усё гэта робіцца пры зачыненых вокнах і дзвярах. Калі пачуецца свіст ветру за акном, грукат у вокны і дзверы, гэта значыць, што нарачоны з'явіўся. Дзяўчына ні ў якім разе не павінна адказваць на яго пытанні і толькі сама ўвесь час пытаць: "Як зваць?" Нарачоны называе сябе, дзяўчына павінна ў тое ж імгненне сказаць: "Цур майго месца! Цур маёй загадкі!" Нарачоны знікае, а дзяўчына ведае імя будучага жаніха.

Каб даведацца, колькі дзяцей будзе ў дзяўчыны пасля замужжа, трэба ў кілішак з вузкім дном і шырокім рыльцам (каб не лопнула) наліць ваду, апусціць пярсцёнак і выставіць на мароз у патаемным месцы (каб не скралі ліхія людзі) ці ў камеру маразільніка. Калі вада замерзне, то лічаць, што колькасць грудкоў на паверхні лёду паказвае, колькі будзе сыноў, а колькасць ямак — колькасць дачок. Ну, а калі лёд будзе гладкім, дык, верагодна, не будзе ў дзяўчыны дзяцей.

Варажба на сон, ці *начная*, здзяйсняецца падчас сну. Можна пакласці пад галаву грабеньчык са словамі: "Суджаны, раджаны! Расчашы мне галаву!" Нарачоны ў сне абавязкова з'явіцца і расчэша, застаецца толькі добра запомніць у сне яго аблічча.

А можна проста распусціць у невялікай колькасці вады (на адзін глыток) шмат солі, выпіць перад сном і папрасіць: "Суджаны, раджаны, дай мне напіцца!" Пры гэтым неабходна запомніць таго, хто гэта зрабіў у сне. Ёсць таксама вельмі мудрагелісты спосаб убачыць у сне будучага мужа: частку вячэры пакласці пад падушку і запрасіць нарачонага на вячэру. Той мусіць з'явіцца.

Ноччу дзяўчына можа вывесіць перад сваім акном белы льняны ручнік і прыгаворваць: "Суджаны, раджаны, прыйдзі да мяне і вытрыся маім ручнікам. Пакінь след на маім ручніку!" На досвітку ідуць здымаць ручнік. Калі ён сухі, то чакаць жаніха давядзецца доўга, калі вільготны — то пэўна быць у гэтым годзе замужам. А калі здымаць няма чаго, значыць, месца выбралі для варажбы непрыдатнае — ліхія людзі перашкодзілі пра лёс даведацца.

Для больш сур'ёзнай варажбы можна ўзяць люстэрка, паставіць перад ім графін з вадою і запаленыя свечкі з трох бакоў ад графіна. Потым патрэбна пільна ўглядацца ў люстэрка праз графін — гэта дазваляе ўбачыць большасць самых важных падзей наступнага года.

У своеасаблівую групу універсальнай па часе варажбы можна вылучыць варажбу на цыбулі. Кожная з сябровак бярэ цыбуліну, якая ёй найбольш падабаецца, пазначае яе, а потым усе цыбуліны апускаюць у ёмістасць з вадою. Чыя першая прарасце, тая дзяўчына хутчэй і замуж выйдзе.

Можна варажыць і па іголках. Дзве іголкі намазваюць салам ці воскам, апускаюць разам у ваду і назіраюць, як яны тонуць. Калі пайшлі на дно роўна і хутка — жаданне здзейсніцца, сышліся разам — будзе вяселле, леглі адна на адну — выхад замуж у наступным годзе. Калі павернутыя вастрыямі адна да адной — каханне. Разышліся на дне шклянкі — перашкоды, і поспеху ў справах не відаць. Варажыць на іголках могуць мужчыны, жанчыны (нават замужнія), дзяўчаты, і кожны знаходзіць у гэтым спосабе варажбы свае прыкметы.

Вялікая ўвага традыцыйна надаецца і навагоднім прыкметам. Лічыцца, калі дзяўчына парэжа ці ўколе да крыві палец у навагоднюю ноч, то ў надыходзячым годзе абавязкова выйдзе замуж. Асаблівы сэнс надаваўся і звычаю апранацца ў першы дзень новага года ва ўсё новае і на працягу дня некалькі разоў змяняць вопратку. Гэта рабілася для таго, каб ва ўсіх заўсёды былі абновы.

Псіхолагі сцвярджаюць, што ў нашым жыцці ўсё адбываецца менавіта так, як мы загадваем. Нацэліўся чалавек на поспех — і ўвесь час яму казачна шанцуе. А нешчаслівых выпадкаў ён проста не памятае. Варажба — таксама своеасаблівае праграмаванне сябе на поспех і ўдачу.

Але што б вам ні выпала, памятайце: добрае збудзецца, а ў дрэннае верыць наогул не трэба. А самым дзейсным народным сродкам абараніць сябе ад непажаданага павароту лёсу, прадказанаму варажбой, з'яўляецца жарт — не трэба ставіцца да яе сур'ёзна. Часам здараецца, што прадказанне настолькі моцна замацоўваецца ў падсвядомасці, што чалавек міжволі імкнецца яго рэалізаваць, нават насуперак цвярозаму сэнсу. І яно збываецца, але не таму, што было наканаваным.

Калі ж варажба ўспрымаецца як гульня, як неадрыўная частка святочнай атмасферы, становіцца не так крыўдна, калі нешта і не адбылося. Бо ўсё роўна кожны атрымае зарад добрага настрою і павесяліцца на славу.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*студэнт V курса геафака*

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# Пакалядуем!?

У традыцыйнай культуры нашых продкаў захавалася сустрэча Новага года па самым старым на Зямлі, прыродна-натуральным сонечным календары. Яна прыпадае на 20-21 сакавіка.

Сучасны Новы год, адпаведны агульнаеўрапейскаму календару, прыпадае на сярэдзіну зімовага сонцавароту паміж Раством па грыгарыянскім (25 снежня) і юліянскім (7 студзеня) стылях. Новы год паводле апошняга святкуецца 14 студзеня пад назвай Васілле ў гонар Васіля Вялікага.

На гэты час была перанесена з вясны ўся магічная абраднасць валачобніцтва з яго паэтычна-гіпербалізаванай песеннай ідэалізацыяй будучага ўраджаю, дабрабыту, багацця, заможнасці.

З 28 лістапада пачынаецца Піліпаўка (6-тыднёвы перадкалядны пост). Яна доўжыцца да 6 студзеня, калі вечарам наладжваецца ўрачыстая перадкалядная Посная куцця — вячэра з абавязковай ячнай кашай з алеем ці мёдам, разнастайнай варажбой на будучы год.

Каляды пачыналіся 7 студзеня і завяршаліся на Вадохрышча (19 студзеня). У гэтыя два калядныя тыдні адбываліся сапраўдныя тэатралізаваныя беларускія карнавалы. Каляды былі пачаткам язычніцкага святкавання ў гонар зімовага сонцавароту і Каляднага мясаеду пасля 6-тыднёвага Піліпаўскага посту.

Ускладняецца разуменне значэння свята яшчэ і тым, што на язычніцкае святкаванне каляднага сонцавароту наслойваўся хрысціянскі рытуал нараджэння Хрыстова — свята Раства, якое, да таго ж, адзначаецца на Беларусі па каталіцкім (грыгарыянскім) календары 25 снежня, а па праваслаўным (юліянскім) — 7 студзеня.

Уся тэатралізаваная прыгажосць, святочнасць Калядаў ствараецца іх незвычайнай песеннасцю. Галоўнай дзейнай асобай тут часта выступае ачалавечаны вобраз Каляды, якая "прыехала вечарам у маляваным вазочку, на белым кані, прынесла дудачкі ў рэшаце, сама села на покуці лі куцці..."

На Каляды насілі асветленую знутры зорку-"звязду", на якой былі намаляваны розныя казачна-легендарныя фігуркі. Калі шматпрамневую частку звязды круцілі, то гэтыя фігуркі бегалі. У старыя часы звязда была ўвасабленнем ідэі сонцавароту, а з прыняццем хрысціянства набыла яшчэ сімволіку Віфліемскай зоркі, якая асвяціла месца нараджэння Хрыста. У гонар гэтага спявалі:

Неба і зямля, неба і зямля
Радасна спяваюць,
Ангелы людзям, ангелы людзям
Дзіва абвяшчаюць:

Прыпеў:
Хрыстос нарадзіўся,
Бог аб'явіўся.
Ангелы спяваюць,
Пастушкі спяваюць.
Дзіва, дзіва абвяшчаюць.

У Віфліеме, у Віфліеме
Вясёла навіна,
Чыстая Дзева, чыстая Дзева
Нарадзіла сына.

Прыпеў.

І мы дзіцятку, і мы дзіцятку-
Богу паклон дайма.
Славу ўсявышню, славу ўсявышню
Яму заспявайма.

Прыпеў.

Найбольш часта гучала песня, дзе гаспадарам напаміналася пра ўсе галоўныя святы месяца і Зімы: Каляды, Васілле, Вадохрышча. А яшчэ ў студзені на поўначы Беларусі адзначалася вясёлае святкаванне "Жаніцьба Цярэшкі" — водгулле старажытных вясельных звычаяў і забаваў моладзі.

У нашага дзядзькі двор гаражоны,
Дай, Божа, яму шчасця, здароўя!
А ў тым двары да тры карысці.
Да тры карысці, да тры радасці.
Адна радасць — ясна сонейка,
Другая радасць — часты зорачкі,
Трэцяя радасць — ясен месячык.
Ясна сонейка — то жонка яго.
Часты зорачкі — дробны дзетачкі.
Ясен месячык — то сам гаспадар.

***

Ой, чыя дачка, як ягадачка,
Святы вечар, добрым людзям!
Бацькава дачка, як ягадачка.
Як у сені ўвайшла — сені заззялі,
Як у хату ўвайшла — паны ўставалі.
Паны ўставалі, шапкі здымалі:
— Ці то цароўна, ці каралеўна?
— Я не цароўна, не каралеўна,
Бацькава дачка, ясна паннačка.
— Мы ж цябе, краса, не зневажаем,
І са шчадроўкай цябе вітаем.

Любоўна-шлюбная тэма, стварэнне сям'і, заснаванай на лепшых чалавечых пачуццях, заўсёды была прадметам галоўнай увагі ў нашых дзядоў. У іх была выпрацавана своеасаблівая служба знаёмстваў. На працягу доўгіх калядных вечароў выбраныя бацька і матка "жанілі Цярэшку" — зводзілі, падбіралі, навучалі, рыхтавалі да стварэння моцнай сям'і хлопцаў і дзяўчат.



*Фота IREX/PROMEDIA*

Самай важнай часткай гульні-камедыі былі песенькі-"цярэшкі" — чатырохрадковыя камічнага зместу на тыповы матыў, якія надавалі парадыйны характар усім момантам "жаніцьбы", і таму веданне вялікай колькасці тэкстаў "цярэшак" было галоўным у падрыхтоўцы святочнай гульні. Кожная "бабулька" пасля "Жаніцьбы" павінна была праспяваць свайму "дзядульку" адпаведныя цярэшкі.

Старажытнасць паходжання, нацыянальная самабытнасць, непаўторнасць, удзел музыкаў, дыялогі моладзі, "бацькі" і "маткі", насычаныя спевамі, карагодамі, жартамі, гульнямі, творчая імправізацыя як асноўны мастацкі пачатак ператварылі "Жаніцьбу Цярэшкі" ў сапраўдную калядную камедыю, якая чакае свайго таленавітага інтэрпрэтатара на прафесійнай сцэне.

Калі наследаваць народнай традыцыі, падрыхтоўку да Калядаў трэба пачынаць у Піліпаўку (у снежні) з развучвання песень, карагодаў, гульняў, вырабу Казы, Каня, Мядзведзя, Бусла, Жорава, карнавальнага адзення, падрыхтоўкі музыкі, масак і г.д.

Тое, што народныя святы сталі дзяржаўнымі, дае надзею, што унікальная смехавая культура Калядаў, найлепш адпаведная адпачынку, займае сваё належнае месца ў атмасферы чараў, магіі, варажбы, калядных і шчодрых вечароў.

Беларускія каляды — найстаражытнейшы тэатр жыцця, які ўпрыгожвае побыт народа, расквечвае яго паўсядзённасць прыгожымі карагодамі, гульнямі, казкамі, інтэрмедыямі, танцамі, песнямі.

*Васіль ЛІЦЬВІНКА*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
26 снежня 2001 года, серада, № 19 (1848)

ГАРАСКОП

# Конь — асоба спрытная



Фота IREX/PROMEDIA

Перад Новым годам мы ўжо традыцыйна зазіраем ва ўсходні гараскоп: якому знаку належаць наступныя 365 дзён? Няма сумневу, што многія з нашых чытачоў ужо даўно ведаюць, што 2002-і — Год Каня. У мінулым стагоддзі ён выпадаў на наступныя гады — 1906, 1918, 1930, 1942, 1954, 1966, 1978 і 1990. Ніжэй мы пазнаёмім вас з тым, што думаюць пра людзей, народжаных у гэты год, кітайцы і японцы.

Паводле кітайскіх уяўленняў, Конь — асоба прадстаўнічая. У яго добрая фігура, ён умее апранацца. Любіць відовішчы, тэатр, канцэрты, сходы — словам, усе месцы, дзе можна паказаць сябе. Часта паспяхова займаецца якім-небудзь відам спорту. Умее зрабіць камплімент, пабалбатаць. Гэта вясёлая, сімпатычная і нават папулярная асоба.

Конь можа зрабіць кар'еру ў палітыцы, што прынясе яму вялікае задавальненне. Ён умее і любіць кіраваць людзямі. Ён здатны падхапіць думку іншых да таго, як яны самі паспелі яе выказаць. Разам з тым, Конь здольны працаваць не толькі разумова, але і фізічна.

Конь — асоба больш спрытная, чым інтэлігентная, але насамрэч у яго не стае веры ў сябе. Зрэшты, гэта не перашкаджае яму трымацца ўпэўнена.

У Каня, што называецца, "гарачая кроў": ён лёгка губляе ўладу над сваімі эмоцыямі і таму часта траціць дасягнутае. Тыя, хто хоць разназіраў Каня ў гневе, ніколі не стануць яму давяраць, бо гэты гнеў нясе ў сабе нешта неўтаймоўнае. Каб дасягнуць поспеху, Конь павінен стрымліваць свой гнеў.

Конь — эгаіст. Ён будзе без найменшых згрызотаў сумлення таптаць тых, хто апынецца ў яго на шляху, бо ягоная прага славы занадта вялікая. Часцей за ўсё, Конь цікавіцца толькі ўласнымі праблемамі (нават калі яму даводзіцца ўлазіць у справы іншых).

Конь вельмі незалежны, не слухае чужыя парады і робіць так, як захочацца яму самому. Было б няблага, каб ён пакінуў бацькоў яшчэ ў юначым узросце і пачаў жыць уласным жыццём. Што праўда, ён і сам ахвотна гэта зробіць. Калі ён сам створыць сям'ю, яго будзе цешыць, што ён з'яўляецца цэнтральнай фігурай, што ўсё круціцца вакол яго становішча і яго праблем.

Хаця Конь-эгаіст працуе толькі дзеля ўласнага задавальнення і поспеху, плёнам гэтай працы карыстаюцца ўсе. Конь — індывідуал і працаўнік, добры фінансіст. Але, на жаль, ён хутка стамляецца ад сваіх заняткаў — праца гэта, хобі ці каханне. Праўда, пераменлівы характар вядзе да таго, што праз некаторы час Конь бярэцца зноў за тую ж справу з ранейшым спрытам.

Чалавек, народжаны пад знакам Каня, можа мець любую спецыяльнасць, якая не патрабуе самоты і сузірання. Яму заўсёды трэба быць у кампаніі, быць заўсёды шанаваным і чуць хвалу на свой адрас.

У дачыненнях з супрацьлеглым полам Конь выказвае слабасць. Ён можа ўсё кінуць дзеля кахання. Закаханы Конь можа стаць абыякавым да ўсяго астатняга свету, што часта прыводзіць яго да няўдач. Калі яму ўдасца перамагчы гэтую слабасць і калі атрымаецца паставіць розум над эмоцыямі, тады Конь зможа быць шчаслівым і зазнае поспех.

Конь можа звязаць свой лёс з Казой: разам яны пройдуць па-над усялякімі безданямі, бо капрызы і пераменлівы характар Казы будзе браць верх над эгаізмам Каня. Плённым можа быць саюз Каня з Тыграм і Сабакам. Але ні ў якім разе не варта звязваць сваё жыццё з Пацуком, асабліва калі Конь — жанчына. Сувязь гэтых двух "вар'ятаў" можа выкрасаць іскры і прывесці да пакутлівай драмы.

Японцы, як і кітайцы, збольшага прытрымліваюцца такой самай думкі наконт характару чалавека, народжанага ў год Каня. Аднак яны злёгку "папраўляюць" кантынентальных жыхароў. Паводле вераняў японцаў, апроч ужо згаданых знакаў Конь можа звязаць свой лёс таксама з Драконам, Змяёй, Малпай, Пеўнем і Свіннёй. Усе яны ў большай ці меншай ступені падыходзяць яму па характары.

СПАДЧЫНА

# Доўгае жыццё "Дзеванькі"

Як у кожнага чалавека ёсць свая жыццёвая сцежка, так і песня мае асабістую гісторыю. Пра нейкі твор можна забыць праз год ці два, а іншы будзе гучаць у душах і сэрцах людзей стагоддзямі. Час вырашыць, ці спатрэбяцца нашчадкам сённяшнія песні. Мы ж будзем весці гаворку пра мінулае.

Дакладна магу сказаць, што творы мінулых стагоддзяў знаходзяць сваіх прыхільнікаў і сёння сярод творчых калектываў і спеўных гуртоў. Так, яскравы прыклад паэзіі і музыкі пачатку XIX стагоддзя — песня "Дзеванька", якую выконвае спеўны гурт выкладчыкаў і студэнтаў БДУ "Тутэйшая шляхта". Не дужа тактоўна казаць пра жаночы ўзрост, таму я мушу папрасіць прабачэння перш, чым паведамлю, што гэтай "Дзеваньцы" 190 гадкоў! І трэба зазначыць, што яна не такая ўжо і "старэча" (у сэнсе тэматыкі). Дзявочая доля, дзявочае шчасце і дзвесце гадоў таму, і сёння хвалявалі і хвалюючь аднолькава. Сваю гісторыю прапанаваў Ян Баршчэўскі, аўтар верша "Дзеванька":

Ды чым жа твая, дзеванька, галоўка занята?
Можа, табе апрыкрала народная хата?
На каго ж ты пазіраеш, сваё сэрца прыкланяеш?
Не будзе тут лад, не будзе тут лад.

Прыўчыла ты двух хлопчыкаў, як птушак у сеці,
Яны к табе ўдзень і ўночы радыя прыляцеці.
І ты ў іх пабываеш, увесь панскі двор пабуджаеш
На вялікі смех, на вялікі смех.

Прыўчыла ты і лоўчага, прымеўся стралочак,
І дудар тут быў некалі, і наш песнярочак.
А ўсе стральцы і дудары ў хаце не гаспадары.
Не будзеш мець хлеб, не будзеш мець хлеб.

Спадабала агародніка — не к пуці і гэта,
Бо ўсё ж слуга ён панская: не зазнаеш света.
Табе паняй ніяк не быць, і дзетачак табе не ўжыць,
Бо не ўмееш ты, бо не ўмееш ты.

Верш нарадзіўся ў 1809 годзе і быў прысвечаны рэальным падзеям і рэальнай асобе — дваровай служанцы Максімовіч, якую кахаў малады Баршчэўскі. Аўтар асуджае сваю гераіню за тое, што яна раздае каханне паслугачам, жадае выбіцца ў людзі, здраджваючы свайму сумленню.

Многія ведаюць "Дзеваньку" як народны, а не аўтарскі твор. І ў гэтым няма вялікай блытаніны. Упершыню песня была надрукаваная ў 1843 годзе ў альманаху "Rocznik Literacki" з нотамі Антона Абрамовіча. Але там яе прадставілі як народную песню, бо (напэўна, з-за цэнзуры) выдавец не рызыкнуў павесці гаворку пра беларускую літаратуру.

Мастацкі кіраўнік "Тутэйшай шляхты" Лявон Махнач знайшоў гэты твор, які ў выкананні калектыву атрымаў сваё другое жыццё. Завітайце ў госці — і вы пераканаецеся, што песня дагэтуль гучыць па-сучаснаму.

*Юля ШАКАЛІСАВА*



*Удзельніца спеўнага гурта «Тутэйшая шляхта» Святлана Кандабарава-Масціцкая*

ПАСМІХНЕМСЯ!

***

Чым адрозніваецца наш Дзед Мароз ад іхняга Санта-Клаўса? Іхні заўжды цвярозы і адзін, а наш заўжды п'яны і з нейкай дзеўкай.

***

Гусь прачынаецца пад Калядыі пытаецца ў пеўня:

— Ты не ведаеш, чаму гэта я ўсю ноч яблыкі сніў?

***

Jingle Bell, Jingle Bell... Вясёлы час — Каляды. Асабліва для Санта-Клаўса: місіс Клаўс спаліла калядныя печыва, эльфы патрабуюць звышурочныя і не робяць цацкі, а алені ў абед ужэрліся так, што разбілі санкі. Санта ірве бараду ад злосці:

— Каляды на носе, падарункі не падрыхтаваныя, печыва ў сметніцы, а гэтых рагатых алкаголікаў не дабудзішся! А дзе шэндаецца Маленькі Анёлак? Тры гадзіны таму паслаў нягодніка па елку!!!

Адчыняюцца дзверы, і ўвальваецца Маленькі Анёлак:

— Чуеш, дзед, а куды мы дрэва ўторкнем?..

З таго часу і з'явілася традыцыя садзіць на верхавіну ёлкі маленькага анёлка.

І правільна — не трэба хаміць старым людзям.

***

— А давайце паклічам тых, без каго не абыходзіцца ніводзін Новы год!

— Давайце...

— Міліцыя! Міліцыя!

***

Дарагія дзеці — удзельнікі ўчарашняга навагодняга свята! Тых, хто атрымаў два і больш падарункаў, прашу вярнуць хаця б мяшок, футра і бараду. І, калі ласка, адпусціце Снягурку, вы яе не так зразумелі...

Ваш Дзядуля Мароз.

***

У самалёце пасажыр глядзіць у ілюмінатар і спалохана кліча да сябе сцюардэсу:

— Мы што, збіліся з курсу?

— Не, чаму вы так вырашылі?

— Але пад намі снег, тайга, а павінны быць Гаваі.

— Ды не, усё нармальна, проста гэта новыя рускія Новы год святкуюць...

***

Аб'ява ў газеце: "Спадарыні і спадары! Зрабіце Новы год для сваіх дзяцей незабыўным: запрасіце да сябе Дзеда Мароза!

P.S. Спадары, не адмаўляйце і сабе ў гэты вечар у задавальненні — запрасіце да сябе Снягурку".

***

Прыходзіць Дзед Мароз да псіхіятра і кажа:

— Доктар, дапамажыце! Я ў сябе не веру.

***

Новы год! Дзеці сабраліся на свята, водзяць карагоды вакол ёлкі. Прыходзіць Дзед Мароз са Снягуркай:

— Прывітанне, дзеці, прывітанне! Чаго ў нас не стае на ёлцы, дзеці? Агеньчыкаў. Давайце папросім ёлку запаліць агеньчыкі! Раз-два-тры — ёлачка, гары.

Не гарыць. Дзеці зноў спрабуюць сказаць — ёлачка не гарыць. Тут адзін з дзяцей дастае з кішэні сотавы, набірае нумар і кажа:

— Чуеш, бацька, дашлі братву, каб разабраліся, а то ёлка не гарыць.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

26 снежня 2001 года
Падпісана да друку 22.12.2001
Ум. друк. арк. 1
Зак. 5. Тыраж 1000 экз.

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Распрацоўшчык лагатыпа і дызайну газеты У.У. Васюк
Камп'ютэрная вёрстка Андрэя Мікулевіча
Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ
Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Т.М. КАЗАК

Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45.